Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

№ 84 (28700)

4 МАЯ 2018 г.
ПЯТНІЦА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
+TV ПРАГРАМА



**«Дні Стафана Баторыя» ў Гродне**

СТАР. 8



**Слаўгарад: праблемы і шляхі вырашэння**

МС



**Вада з калодзежаў. Піць ці не піць?**

МС

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр КАНЮК, генеральны пракурор:**

*«Асноўныя задачы ў перыяд пасяўной кампаніі — забяспечыць гатоўнасць і захаванасць сельскагаспадарчай тэхнікі, наяўнасць у прадпрыемстваў угнаенняў, іх належнае захоўванне, своечасовасць выплаты заработнай платы, недапушчэнне «механічнага» прыцягнення кіраўнікоў прадпрыемстваў да адміністрацыйнай адказнасці за невыкананне працоўнага заканадаўства. У прыватнасці, пры затрымцы аплаты на 1-2 дні. Павышаная ўвага павінна ўдзяляцца пытанням пажарнай бяспекі, кантролю за працоўнай дысцыплінай, скарачэння дэбіторскай запазычанасці».*

# ІСНАВАЛІ, ІСНУЮЦЬ І БУДУЦЬ ІСНАВАЦЬ!



Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

**У сталічным выставачным цэнтры «Белэкспа», што на праспекце Пераможцаў, 14, пачала працаваць XXII Міжнародная спецыялізаваная выстава «СМІ ў Беларусі». Шматлікія сродкі масавай інфармацыі, найлепшыя журналісты, самыя адданыя чытачы, слухачы і гледачы — гэта месца стала пунктам сустрэчы ўсіх зацікаўленых.**

У выставе, якая будзе доўжыцца да 5 мая, прымаюць удзел больш як 50 экспанентаў. Яны прадстаўляюць каля 400 сродкаў масавай інфармацыі з Беларусі, Расіі, Украіны, Казахстана, Латвіі, Літвы, Польшчы, Кітая, Турцыі і іншых краін. Экспазіцыя размясцілася на плошчы больш за 1 тыс. кв. м.

На ўрачыстым адкрыцці выставы **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Уладзімір ЖАЎНЯК** зачытаў прывітальнае слова Аляксандра Лукашэнкі: «Гэты форум праходзіць ужо на працягу двух дзесяцігоддзяў і з'яўляецца месцам актыўнага абмеркавання сродкамі масавай інфармацыі пытанняў развіцця медыясферы і ўмацавання партнёрскіх сувязяў. Тут рэгулярна дэманструюцца апошнія дасягненні ў рабоце друкаваных выданняў, радыё і тэлебачання, інтэрнэт-рэсурсаў. Асабліва прыемна адзначыць цікавасць да выставы прадстаўнікоў шырокага кола замежных краін.

СТАР. 3

**На выставе «СМІ ў Беларусі» прадстаўлена каля 50 экспанентаў**





Фота БелТА.

■ Падрабязнасці

# ПРАЦАВАЦЬ У ВОДПУСКУ... ДАЗВАЛЯЕЦЦА?

## Тлумачым, што можа змяніцца ў Працоўным кодэксе

**Падчас водпуску дазволяць працаваць у іншай кампаніі поўны дзень, дыстанцыйныя работнікі змогуць разлічваць на бальнічныя, а адзінокім татам нельга будзе неабгрунтавана адмовіць у заключэнні дагавора. Такія папраўкі плануюць унесці ў Працоўны кодэкс, які дэпутаты разгледзяць на бягучай сесіі. Чым выклікана неабходнасць змен, расказалі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны.**

### Гарантыі для ўсіх

Сярод прапаноў — замацаваць у кодэксе паняцце «дыстанцыйная работа».

— Актыўнае развіццё IT-тэхналогій дазваляе арганізоўваць працу, не ствараючы канкрэтнага працоўнага месца. Гэта задавольвае і наймальніка, і работніка, бо ён дастаткова свабодна можа распараджацца сваім часам, — кажа **начальнік галоўнага юрыдычнага ўпраўлення Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Валянціна МАСЛОЎСКАЯ.**

Цяпер са спецыялістамі, якія выконваюць заданні дыстанцыйна, заключаюць грамадзянска-прававы дагавор. Пасля паправак у кодэксе яны змогуць разлічваць на працоўны дагавор, а значыць і на тыя гарантыі, якія даюцца штатным работнікам. Першае — забеспячэнне мінімальнага заробку (ён складае 305 рублёў). Другое — аплатны водпуск: 24 каляндарныя дні асноўнага плюс ад аднаго да пяці дзён дадатковых. Трэцяе — бальнічны.

Працоўны дагавор будзе заключацца пры асабістай прысутнасці работніка. Далейшыя перамовы (аб умовах працы, выніках выкананай работы) і дакументазварот з наймальнікам могуць весціся па электроннай пошце. Спосаб і перыядычнасць працоўных кантактаў будуць вызначацца ў кантракце. Графік работы таксама прапісваецца бакамі на выбар. Пры гэтым працягласць працоўнага часу не можа перавышаць 40 гадзін на тыдзень. Усё, што больш, мусіць аплачвацца адпаведна. Але звышурочная



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

работа не можа быць неабмежаванай — максімум 10 гадзін на тыдзень і 180 у год.

— Людзі будуць мець права выбіраць: заключаць грамадзянска-прававы або працоўны дагавор. Але першы скіраваны на выкананне разавай работы, а другі мае на ўвазе пастаянныя і працяглыя адносіны, — заўважае Валянціна Маслоўская.

СТАР. 5

ISSN 1990 - 763X
18084>